Пазаўчора ў Маскве закончыў сваю работу чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум аднадушна прыняў пастанову па дакладу Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева «Аб міжнароднай дзейнасці ЦК КПСС пасля XXIV з'езда партыі».

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (829) ● Чацвер, 25 лістапада 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

*ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ*

## ГАЛОЎНАЕ — ПАЛІТЫЧНАЯ ЗАГАРТОЎКА І МАЙСТЭРСТВА

**«З'езд надае вялікае значэнне далейшаму паляпшэнню дзейнасці друку, радыё і тэлебачання. Партыйныя арганізацыі павінны ўмела выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі і прапаганды, клапаціцца аб дзейснасці і аператыўнасці іх работы, аб павышэнні палітычнай загартоўкі і майстэрства журналісцкіх і прапагандысцкіх кадраў».**

(З Рэзалюцыі XXIV з'езда КПСС).

Задачы, пастаўленыя XXIV з'ездам КПСС і ў прамове Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў, дакладна акрэсленыя. А як іх лепш рашаць — аб гэтым думаюць цяпер камуністы. Вось чаму на партыйным сходзе журфака так гарача абмяркоўвалася ўдасканаленне навучальнага працэсу, выхаванне ідэйна загартаваных, шырока адукаваных журналістаў — памочнікаў партыі.

Выступаючы з дакладам, дэкан факультэта Р. В. Булацкі, дэлегат нядаўна прайшоўшага рэспубліканскага з'езда журналістаў прывёў цікавыя факты і лічбы: журфак БДУ старэйшы за факультэты журналістыкі Маскоўскага і Ленінградскага універсітэтаў. За 27 год яго існавання адбылося 24 выпускі, падрыхтавана звыш 1400 спецыялістаў — работнікаў друку, радыё, тэлебачання, выдавецтваў і інфармацыйных агенцтваў. Многія рэдакцыі газет амаль поўнасцю ўкамплектаваны выпускнікамі факультэта: у рэдакцыях «Звязды» іх —22, «Знамени юности» — каля 20, «Чырвонай змены» — 17, «Мінскай праўды» — 15, «Вячэрняга Мінска» — 14, «Сельской газеты» — 20, «Гомельскай праўды» — 13; на Беларускім радыё і тэлебачанні плённа працуюць каля 90 выхаванцаў факультэта. Значная частка пісьменнікаў і паэтаў рэспублікі — выпускнікі журфака.

На факультэце склаўся вопытны калектыў выкладчыкаў, 16 з 22 маюць вучоныя ступені і званні. За апошнія 5—6 год асабліва актывізавалася навуковая праца ў галіне гісторыі, тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку Беларусі, з'явіліся даследаванні, прысвечаныя публіцыстычнай спадчыне У. І. Леніна і публіцыстам ленінскай школы, беларускай стылістыцы і іншыя. Сур'ёзнымі працамі заявіла аб сабе студэнцкае навуковае таварыства.

Аднак узровень сучаснага жыцця, перспектывы ўсё ўзрастаючага навукова-тэхнічнага прагрэсу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі краіны прад'яўляюць кожнаму новаму пакаленню выпускнікоў усё больш высокія патрабаванні. І аб гэтым гаварылі дакладчык і выступіўшыя ў спрэчках камуністы А. І. Раковіч, Я. Л. Бондарава, М. М. Клімко, Б. В. Стральцоў, сакратар партбюро М. Е. Дастанка, студэнт А. Міхальчанка.

Цяпер усё больш акрэсліваецца неабходнасць спалучаць шырокую гуманітарную адукацыю будучых журналістаў з пэўнай спецыялізацыяй. Гэтаму паслужаць новыя спецкурсы і спецсемінары, выступленні перад студэнтамі вядучых вучоных-фізікаў, хімікаў, біёлагаў з агляднымі лекцыямі, знаёмства з асновамі навуковай арганізацыі працы, з вылічальнай тэхнікай.

Выказваліся думкі, меркаванні, калі лепш уводзіць спецыялізацыю, па якіх галінах навукі прыцягваць спецыялістаў, як рацыянальней арганізаваць вучэбную, вытворчую практыку, навуковую працу студэнтаў, каб яны садзейнічалі выпрацоўцы ў будучых работнікаў друку журналісцкага майстэрства.

Асаблівая размова адбылася аб выкладанні эканамічных дысцыплін. Выказан сур'ёзны папрок кафедры палітычнай эканоміі універсітэта, якая адказны курс эканомікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі ўсклала на плечы аднаго выкладчыка-пенсіянера. Не адпавядае задачам глыбокай філасофскай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў і тое становішча, што на працягу раду год на журфаку не чытаюць лекцыйныя курсы вядучыя прафесары філасофскіх кафедр, кафедры навуковага камунізму.

— На Усесаюзным студэнцкім злёце, у прамове П. М. Машэрава на з'ездзе журналістаў, — падкрэсліў сакратар партбюро М. Е. Дастанка, — асаблівая ўвага звернута на ідэйную загартоўку моладзі. Гэта прама адносіцца да нашага факультэта, бо журналіст—ідэйны баец і памочнік партыі. І наша задача — зрабіць усё для таго, каб выпускнікі факультэта поўнасцю адпавядалі свайму высокаму прызначэнню. Трэба думаць ужо аб тым, што цяперашнія першакурснікі будуць працаваць у 1980 годзе, і рыхтаваць іх да гэтага, клапаціцца аб узроўні ведаў, кругаглядзе, па магчымасці ранняй спецыялізацыі.

Камуністы факультэта прааналізавалі, як выкарыстоўваюцца магчымасці спецыялізацыі, вучэбнай і вытворчай практыкі, навуковай працы. Гаварылі і аб тым, што перашкаджае паспяховай рабоце: недахоп выкладчыкаў, вучэбных плошчаў, добра абсталяваных кабінетаў і г. д.

Востра стаяла пытанне аб дысцыпліне і паспяховасці студэнтаў, аб адказнасці камуністаў і камсамольцаў за якасць ведаў і прафесіянальную падрыхтоўку да работы ў друку, на тэлебачанні, радыё.

У прынятай пастанове прапанавана: арганізаваць для студэнтаў чытанне лекцый аб навейшых дасягненнях прыродазнаўчых навук; дабіцца такога становішча, каб студэнты супрацоўнічалі з рэдакцыямі газет, радыё і тэлебачання на працягу ўсіх год навучання; з мэтай далейшай спецыялізацыі навучання распрацаваць новыя спецкурсы і спецсемінары; кафедрам факультэта больш актыўна ўздзейнічаць на паляпшэнне вучэбна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў; камітэту камсамола факультэта падрыхтаваць і правесці курсавыя камсамольскія сходы, на якіх абмеркаваць задачы, вынікаючыя з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў і матэрыялаў IV з'езда журналістаў БССР.

**А. АЛЕНІЧ.**

## КЛЮЧЫ ДА ПОСПЕХУ

Зрабіць камсамольскае жыццё цікавым і паўнакроўным — задача нялёгкая. Адразу яе не вырашыш. Тут патрэбна доўгая і карпатлівая праца, настойлівая вучоба актыву.

207 чалавек прысутнічала на семінары камсамольскага актыву, што праводзіўся на фізфаку. Размова вялася па многіх пытаннях: аргработа, Ленінскі залік, шэфская работа, мастацкая самадзейнасць.

Вельмі слушнымі з'явіліся заўвагі намесніка сакратара камітэта камсамола Сяргея Блінова аб правядзенні Ленінскага заліку. «Менш фармалізму, больш творчасці» — вось асноўная думка яго выступлення. Сяргей гаварыў, што можа зрабіць кожная група, каб Ленінскі залік прайшоў з максімальнай аддачай для кожнага. Узяць, напрыклад, шэфскую работу. Часта яна абмяжоўваецца збіраннем кніг для сельскіх школ. А можна ж стольکі зрабіць: і кабінеты абсталяваць у школах, і важатых назначыць, і выкладаць на грамадскіх падрыхтоўчых курсах, і іншае.

У зале сядзелі сакратары камсамольскіх арганізацый груп, патокаў, члены курсавых бюро, а з трыбуны з імі па-сяброўску гутарылі іх старэйшыя, больш вопытныя таварышы.

Толькі, здаецца, не ўсё атрымалася добра. Штампаваныя фразы некаторых аратараў, часам нейкі гул у зале перашкаджалі сапраўды шчырай гутарцы на працягу ўсяго семінара. Значыць, трэба думаць яшчэ і яшчэ. Знаходзіць нейкія ключыкі ўзаемнай шчырасці. А галоўнае — праводзіць вучобу актыву часцей.

**П. ДРУЗЕВА.**



**Кожны студэнцкі дзень насычан напружанай працай. Экзаменацыйная сесія зусім блізка, і аб гэтым не забываюць ні студэнты, ні выкладчыкі. Клопат ва ўсіх адзін—лепш выкарыстаць час, які яшчэ застаўся. Больш актыўна праходзяць семінары. Старанна працуюць студэнты на практычных занятках.**

*НА ЗДЫМКАХ: першакурснікі аддзялення радыёфізікі выконваюць лабараторныя работы па механіцы. У цэнтры — выкладчык Г. М. БЛІНКОЎ правярае вынікі працы студэнтаў.*

Фота **Д. Чаховіча.**





**НА БІЯФАКУ**

## УРОК ПАТРЫЯТЫЗМУ

**Напярэдадні Дня ракетных войск і артылерыі перад студэнтамі II курса біяфака выступіў генерал-маёр у адстаўцы Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў. Ён расказаў аб слаўных подзвігах савецкага народа ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.**

## РАШАЕ АКАДЭМКАМІСІЯ

— Найбольш арганізавана ў нашым камітэце камсамола працуе акадэмічны сектар, — гаворыць камсамольскі важак біялагічнага факультэта Вольга Нясюк. — І гэта не дзіўна, бо кожны камсамолец разумее, што яго галоўная задача — добра вучыцца.

На факультэце створана акадэмічная камісія, у якую ўвайшлі кіраўнікі акадэмкамісій курсаў. Узначаліла яе студэнтка IV курса Тамара Голік.

— Вопыт падказвае, — гаворыць Тамара, — што, як правіла, студэнт, які рэгулярна наведвае заняткі, мае станоўчыя вынікі і на экзаменах. Таму акадэмічная камісія рэгулярна, 2—3 разы ў тыдзень, правярае наведванне лекцый. Студэнтаў, у якіх шмат пропускаў, выклікаем на пасяджэнні камітэта камсамола. На адным з такіх пасяджэнняў было выяўлена, што асабліва часта прапускаюць лекцыі, як ні дзіўна, першакурснікі.

Кожнаму з парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны мы выносім строгае папярэджанне, а некаторыя трапляюць і ў «Камсамольскі пражэктар». Акрамя таго, вынікі праверак знаходзяць сваё адлюстраванне ў інфармацыйных бюлетэнях.

Цяпер у плане работы акадэмічнага сектара — праверыць падрыхтоўку студэнтаў да семінараў па грамадскіх дысцыплінах і ўмовы такой падрыхтоўкі да заняткаў у інтэрнаце. Намечана таксама арганізаваць сустрэчы студэнтаў II курса з выкладчыкамі кафедр па пытанню спецыялізацыі, сустрэчы выдатнікаў-старшакурснікаў са студэнтамі першага курса. Акадэмічны сектар працягвае сваю традыцыю — прымае ўдзел у рабоце стыпендыяльнай камісіі.

**В. РАКІЦКІ,**
**студэнт.**

Старшы выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін Валерый Антонавіч **Калечыц** праводзіць практычныя заняткі па геамарфалогіі ў студэнтаў II курса геафака.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



## ФІЛФАК—СЕЛЬСКАЙ ШКОЛЕ

**Даўно сябруюць філфакаўцы з сельскімі школьнікамі: прыязджаюць да іх з лекцыямі, выступаюць з канцэртамі, прывозяць кнігі для бібліятэкі. Вось і цяпер філолагі збіраюцца ў чарговую паездку ў Нававёскаўскую школу Стаўбцоўскага раёна. Там яны ўжо неаднойчы пабывалі з агітбрыгадай. На гэты раз студэнты падрыхтавалі для сваіх падшэфных тэматычны вечар, прысвечаны Сяргею Ясеніну.**

**— У гэтай школе, — гаворыць Тамара Савіч, студэнтка II курса беларускага аддзялення, адказная за шэфскую работу філфака, — мы праводзім самую разнастайную работу: чытаем лекцыі аб універсітэце, бліжэй пазнаёмілі вучняў з сучаснай літаратурай, перадалі кнігі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.**

**Шэфства студэнтаў аказвае немалую дапамогу педагогам у выхаванні дзяцей, пашырае кругагляд школьнікаў. Але не меншая карысць і для саміх студэнтаў, бо яны — будучыя настаўнікі. Наведванне ўрокаў, работа з вучнямі прывіваюць любоў да прафесіі, выпрацоўваюць патрэбныя навыкі.**

**У. РУБАНАЎ,**
**студэнт.**

# НЕ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

*НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ*

Кафедра крымінальнага права дасягнула пэўных поспехаў у арганізацыі вучэбна-метадычнай, навуковай і выхаваўчай работы, што было адзначана пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва — калектыў узнагароджан Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта. Многія работнікі кафедры атрымалі ўзнагароды ў сувязі з 50-годдзем БДУ.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў кафедры ўдзяляе вялікую ўвагу падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Нядаўна выйшла з друку кніга «Крымінальнае права БССР. Частка Асаблівая» аб'ёмам 26 друкаваных аркушаў. У трэцім квартале будучага года выйдзе ў свет падручнік «Крымінальнае права БССР. Частка Агульная» аб'ёмам 29 друкаваных аркушаў. Раней такога роду вучэбнай літаратуры па крымінальнаму праву ў нашай рэспубліцы не выдавалася. Гэта, па сутнасці, першы вопыт выдання падручніка па крымінальнаму праву прымяняльна да заканадаўства і судовай практыкі саюзнай рэспублікі без дапамогі вучоных з іншых рэспублік. Выданне кафедрамі юрыдычнага факультэта БДУ такіх падручнікаў па розных галінах юрыдычных ведаў (крымінальнаму працэсу, судовай псіхалогіі, судовай фатаграфіі і інш.)— заканамерная з'ява, адно са сведчанняў няўхільнага росту навукова-педагагічнага майстэрства вучоных, якія прадстаўляюць цяпер адзін з буйнейшых навуковых калектываў краіны. На факультэце працуюць 11 дактароў і прафесараў, 34 кандыдаты навук і дацэнты.

Вялікую дапамогу судова-пракурорскім работнікам і студэнтам аказвае падрыхтаваны членамі кафедры Каментарый да Крымінальнага кодэксу Беларускай ССР, які ўжо вытрымаў тры выданні.

Прафесарам І. І. Гарэлікам і асістэнтам А. В. Шыбко складзена бібліяграфія літаратуры па крымінальнаму праву, выдадзенай у БССР у 1919—1945 гадах. Раней падобная работа ў рэспубліцы не праводзілася.

Падрыхтаваны і выдадзены на ратапрынце планы вучэбных заняткаў па крымінальнаму праву і судовай статыстыцы для ўсіх курсаў дзённага і вячэрняга аддзяленняў на ўвесь навучальны год. Распрацаваны і разасланы студэнтам юрыдычнага аддзялення завочнага факультэта метадычныя пісьмы аб падахах курсавых і кантрольных работ, што, несумненна, садзейнічала павышэнню якасці студэнцкіх работ. Сіламі студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў падрыхтавана 20 наглядных дапаможнікаў па крымінальнаму праву.

У 1966—1971 гадах членамі кафедры зроблена 17 дакладаў на міжвузаўскіх, рэспубліканскіх і універсітэцкіх навуковых канферэнцыях (у Львове, Адэсе, Маскве, Варонежы, Харкаве і Мінску). У тыя ж гады выкладчыкамі і аспірантамі кафедры выдадзена 4 манаграфіі (аўтары І. І. Гарэлік, В. Ц. Калмыкоў, Е. В. Кічыгіна, І. С. Цішкевіч) і ў сааўтарстве 8 вялікіх калектыўных работ (аўтары І. І. Гарэлік, П. А. Дубавец, В. Ц. Калмыкоў, М. Н. Меркушаў, І. С. Цішкевіч, В. А. Шкурко), апублікавана 60 артыкулаў у навуковых зборніках і часопісах, а таксама многа артыкулаў на прававыя тэмы ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. П. А. Дубаўцу і мне давялося выступіць у замежных выданнях.

Сярод навуковых работ, апублікаваных членамі кафедры ў 1971 годзе, асабліва неабходна выдзеліць манаграфію прафесара І. І. Гарэліка «Прававыя аспекты перасадкі органаў і тканей», выпушчаную мясцовым выдавецтвам «Вышэйшая школа». Гэта кніга, а таксама апублікаваныя яе аўтарам артыкулы па той жа тэме ў галоўным юрыдычным часопісе краіны «Савецкая дзяржава і права», несумненна, зацікавяць савецкіх і замежных вучоных — юрыстаў і медыкаў, паколькі ў гэтых публікацыях даследуюцца мала распрацаваныя нашай навукай прававыя праблемы, звязаныя з навуковым прагрэсам у такой важнай галіне, як медыцына.

Вялікая роля членаў кафедры і ў выхаванні студэнтаў. Усе яны неаднаразова выбіраліся ў састаў парткома і мясцкома універсітэта, партыйнага і прафсаюзнага бюро факультэта, абкома прафсаюза. У цяперашні час тры члены кафедры ўваходзяць у састаў партбюро, тры з'яўляюцца куратарамі вучэбных груп. Усе маюць пастаянныя грамадскія даручэнні. Пытанні выхаваўчай работы неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры. Выкладчыкі рэгулярна выступаюць з лекцыямі на палітычныя і прававыя тэмы перад работнікамі судова-пракурорскіх органаў, дзяржаўных устаноў, слухачамі грамадскіх універсітэтаў савецкага заканадаўства і насельніцтвам. Толькі ў мінулым навучальным годзе прачытана 54 лекцыі. Найбольш актыўны ўдзел у гэтай рабоце прымае ст. выкладчык А. А. Прымачонак. Ён не толькі сам вельмі часта выступае з лекцыямі, але і далучае да гэтай работы найбольш паспяваючых студэнтаў, аказваючы ім неабходную дапамогу. На працягу 1970-71 навучальнага года А. А. Прымачонак прачытаў 25 лекцый, а за два месяцы гэтага навучальнага года—7 лекцый для насельніцтва і вучняў старэйшых класаў сярэдніх школ Мінска і іншых гарадоў рэспублікі. Прачытаўшы студэнтам V курса дзённага аддзялення юрыдычнага факультэта 20-гадзінны спецкурс «Праблемы папярэджання злачынстваў непаўналетніх», А. А. Прымачонак падабраў з ліку студэнтаў 39 найбольш падрыхтаваных таварышаў, належным чынам іх пракансультаваў і арганізаваў чытанне імі лекцый у 7—10-х класах дзевяці сярэдніх школ Мінска па дзвюх тэмах: «Адказнасць непаўналетніх па Крымінальнаму Кодэксу БССР» і «Барацьба са злачыннасцю непаўналетніх у СССР». Усяго прачытана 43 лекцыі, аб якіх атрыманы добрыя водгукі. Па гэтай тэматыцы А. А. Прымачонкам падрыхтавана метадычная распрацоўка для лектараў.

Кафедра мае намер і ў далейшым прыцягваць найбольш актыўных членаў навуковых гурткоў па крымінальнаму праву (іх пры кафедры два) для чытання лекцый насельніцтву і вучням. Маладыя лектары атрымаюць неабходную метадычную дапамогу: выкладчыкі прачытаюць для іх інструктыўныя даклады, будуць выдадзены па лініі таварыства «Веды» прыкладныя тэксты лекцый і г.д. Уяўляецца мэтазгодным з удзелам іншых кафедр юрыдычнага факультэта арганізаваць у Мінску пастаянна дзейнічаючы лекторый па пытаннях права для вучняў старэйшых класаў сярэдніх школ, прычым для чытання лекцый па загадзя складзенай і абмеркаванай тэматыцы пажадана далучаць не толькі навуковых работнікаў, але і суддзяў, пракурораў, супрацоўнікаў органаў МУС, следчых, адвакатаў.

Члены кафедры падтрымліваюць цесную сувязь з практыкай, выконваючы абавязкі народных засядацеляў абласнога суда (І. І. Гарэлік), народных судоў (П. А. Дубавец, О. Л. Пруднічэнка), членаў навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным судзе БССР (І. І. Гарэлік, М. Н. Меркушаў, І. С. Цішкевіч, В. А. Шкурко), савета па вывучэнню прычын злачыннасці і распрацоўцы мер па яе папярэджанні пры УУС Мінгарвыканкома (А. А. Прымачонак). Вучоныя ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і абмеркаванні праектаў законаў і кіруючых пастаноў пленумаў Вярхоўных Судоў СССР і БССР.

Такія асноўныя паказчыкі работы кафедры. Але ёй яшчэ неабходна многае зрабіць для далейшага паляпшэння вучэбна-метадычнай, навуковай і выхаваўчай работы. Ужо распачата работа па падрыхтоўцы разам з іншымі зацікаўленымі ведамствамі Каментарыя да нядаўна прынятага Папраўча-працоўнага кодэксу БССР. Завяршаецца падрыхтоўка зборніка артыкулаў «Развіццё крымінальнага права ў Беларускай ССР». Працягваецца вывучэнне гісторыі развіцця крымінальнага заканадаўства БССР і практыкі яго прымянення (па гэтай тэматыцы ўжо маецца некалькі публікацый). Будуць выдадзены навукова-папулярныя брашуры па крымінальнаму праву для насельніцтва. Добра было б разам з іншымі кафедрамі, работнікамі МЮ БССР і філолагамі пачаць карпатлівую, але вельмі важную працу па падрыхтоўцы руска-беларускага і беларуска-рускага юрыдычнага слоўніка.

У цяперашні час работнікі кафедры, натхнёныя прывітаннем ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў рэспублікі калектыву БДУ ў сувязі з 50-годдзем з дня заснавання універсітэта, прыкладаюць усе намаганні для таго, каб дабіцца далейшага паглыблення ведаў студэнтаў, выхавання іх у духу камунізму. Своечасова распачата падрыхтоўка да зімовай экзаменацыйнай сесіі. У прыватнасці, у планы бягучых семінарскіх заняткаў разам з новым матэрыялам уключаюцца заданні на паўтарэнне пройдзеных тэм, праводзяцца кантрольныя пісьмовыя работы і калёквіумы па найбольш складаных і цяжкіх для засваення праблемах вучэбных дысцыплін, актывізуецца навуковая праца студэнтаў.

Першае месца па паспяховасці ва універсітэце да многага абавязвае ўсе кафедры юрфака. Наперадзе ўпартая, цяжкая, але высакародная праца. Ёсць усе падставы спадзявацца, што прафесарска - выкладчыцкі калектыў юрыдычнага факультэта паспяхова справіцца з пастаўленымі перад ім задачамі.

**І. ЦІШКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры крымінальнага права.**

# ВІТАМІН ПАСПЯХОВАСЦІ

Рабят тут усё захоплівае. І аўдыторыі, шырокія, прасторныя, светлыя, і студэнты з розных краін, і сам універсітэт, пра які так многа чулі яны — вучні Апечкаўскай васьмігодкі Стаўбцоўскага раёна. Тры гады прайшло з той пары, як калектыў гістарычнага факультэта ўзяў шэфства над гэтай школай. Многа разоў за гэты час студэнты пабывалі ў калгасе, на тэрыторыі якога знаходзіцца школа. А цяпер 26 лепшых вучняў 4—8 класаў школы — госці універсітэта. Разам са студэнткамі Вольгай Данільчанка і Лідай Аборынай яны крочаць па універсітэту. Рабятам цікава паглядзець і выстаўку, прысвечаную юбілею БДУ, і экспанаты гістарычнага музея, пра якія цікава расказвае загадчык музея В. Р. Рудкін. Шмат уражанняў засталося ад наведання выстаўкі прыбораў, што была адкрыта на фізічным факультэце, і ад сустрэчы з заслужаным дзеячом навукі і тэхнікі БССР, загадчыкам кафедры электрафізікі Уладзімірам Гаўрылавічам Вафіядзі.

— Мне спадабалася ва універсітэце ўсё, — расказвае Наташа Яфімава, вучаніца 7 класа. — Столькі новага, цікавага я ўбачыла. Калі скончу школу, абавязкова буду паступаць сюды.

— Здзіўляюча прыгожыя будынкі універсітэта, — гаворыць Ніна Конюх, сакратар камсамольскай арганізацыі, вучаніца 8 класа, — Я зайздрошчу тым, хто вучыцца ў гэтай навучальнай установе.

Уражанняў у рабят шмат. Магчыма, праз некалькі год яны зменяць у аўдыторыях сваіх старэйшых сяброў, братоў, сясцёр і самі пойдуць па прывабнай сцяжынцы навукі, на якую пакліча іх сённяшняя сустрэча з універсітэтам.

— Экскурсія ўмацуе сувязі нашай школы са старэйшай вну Беларусі, плённа падзейнічае на вучобу рабят, пашырыць іх кругагляд, — у гэтым упэўнен кіраўнік экскурсіі — дырэктар Апечкаўскай школы Браніслаў Іванавіч Шыркоўскі.

**І. СЦЯПУРА.**

АТ 09502

# ПАДАРОЖЖА... У ГІСТОРЫЮ

Гэтае падарожжа ў Вільнюс — не першае наша літаратурнае падарожжа. У прыватнасці, летась члены гуртка наведалі радзіму Янкі Купалы — Вязынку, ездзілі ў Мікалаеўшчыну — на радзіму Якуба Коласа. З Вільнюсам беларуская літаратура і культура звязаны вельмі цесна. Да Вялікага Кастрычніка сённяшняя сталіца Літвы была па сутнасці адным з цэнтраў беларускай культуры. Тут выдаваліся першыя беларускія газеты «Наша доля» і «Наша ніва», жылі і працавалі Якуб Колас, Янка Купала, Змітрок Бядуля. У Вільню прыязджаў Максім Багдановіч і пасля ўславіў горад у сваіх шматлікіх вершах.

Раней, у мінулым стагоддзі, вузкімі вулачкамі горада праходзіў Кастусь Каліноўскі, абдумваючы да драбніц план паўстання 1863 года. А ў трыццатыя гады нашага стагоддзя тут гучала палкае рэвалюцыйнае слова Максіма Танка. Гучала як водгалас на колішнія смелыя заклікі паэтэсы-рэвалюцыянеркі Цёткі — таксама цесна звязанай сваім лёсам з гэтай непаўторнай мясцінай. Безумоўна, знаёмства з Вільнюсам можа дапамагчы глыбей зразумець многія пытанні з гісторыі роднай літаратуры.

І вось мы ў гэтым горадзе.

З Гедымінавай вежы, на якую, дарэчы, узбіраўся і Антось — герой Коласавай «Новай зямлі», адкрываецца шырачэзная, чароўная панарама старажытнага Вільнюса, што размясціўся ў асноўным на правым беразе ракі Віліі. Кожная вулачка Вільнюса, кожны гарадскі квартал мае свае выдатныя помнікі архітэктуры.

Старажытныя вежы, замкі, храмы... Бачыш усё гэта, і ўсплываюць у памяці словы Багдановіча: «О, горада чароўныя прынады!». Інакшага ўражання аб горадзе ўзнікнуць не можа.

А вы бачылі калі-небудзь храм Святой Анны! Калі не бачылі, дык вам могуць дапамагчы ўявіць яго наступныя радкі верша Багдановіча «Костел Святой Анны в Вильне»:

Изломом строгим в небе
ясном
Встает, как вырезной,
колосс.
О как легко в порыве
страстном
Он башенки свои вознес!
А острия их так высоко,
Так тонко в глубь
небес идут,
Что миг один, и —
видит око —
Они средь сини ввысь
плывут.
Как будто с грубою
землею
Простясь, чтоб в небе
потонуть,
Храм стройный легкою
стопою
В лазури пролагает путь.

Вільнюс — горад, багаты гістарычным мінулым. Маўклівай суровасцю патыхаюць цёмныя і сырыя сцены турмы-крэпасці, у якой чакаў свайго прысуду беларускі рэвалюцыянер-пісьменнік Кастусь Каліноўскі.

У цэнтры горада, на плошчы Леніна, дзе захаваны астанкі К. Каліноўскага і З. Серакоўскага, знаходзіцца шэрая каменная пліта з надпісам «1863 год»—сведка тых памятных дзён.

На вуліцы Людаса Гіра, побач з домам, дзе жыў літоўскі кампазітар і мастак Чурлёніс, захаваўся домік Янкі Купалы. Тут жыў пэўны час народны паэт Беларусі — так сведчыць памятная мемарыяльная дошка.

Нельга расказаць аб усім, што ўбачана, як і немагчыма выкласці на паперы ўсе думкі і пачуцці, выкліканыя цудоўным горадам, яго помнікамі.

Калі пакідалі Вільнюс, над горадам апускаўся вечар. Тысячамі агнёў засвяціліся шматпавярховыя дамы новага Вільнюса. А ў старым горадзе

Маўчаліва ўсталі —
і сняць
У небе купалы, брамы,
байніцы і шпіцы;
Грук хады адзінокай
здалёку чуваць,
Часам мерныя ўдары
звана задрыжаць
І замоўкнуць, памкнуўшы
ад старай званіцы.
(М. Багдановіч).

На вежы, ззяючы залатым бляскам, адлічвае гадзіны, гады і стагоддзі горада «цыферблат — пільны сведка мінулых учынкаў».

І. ЗЯНЬКОВІЧ,
У. ЛАЙКОЎ,
члены гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.

# СТАРЭЙШЫНА БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

Нядаўна старэйшаму беларускаму мастаку Міхаілу Пятровічу Станюце споўнілася 90 год. Усё яго жыццё і творчы лёс звязаны з Мінскам. Тут ён нарадзіўся, памятае ціхі Менск і народныя хваляванні 1905 года, бачыў і амаль не стаў ахвярай Курлаўскага расстрэлу на прывакзальнай плошчы, перажыў жахі сусветнай вайны і спазнаў урачыстасць перамог Вялікага Кастрычніка. На яго вачах адбываліся пераўтварэнні першых год Савецкай Беларусі.

У 1920 годзе пасля вучобы ў Маскве ва ВХУТЭМАСе, дзе яго настаўнікамі былі праслаўленыя мастакі А. Е. Архіпаў, Н. А. Касаткін, Міхась Станюта быў накіраван у Мінск «на мастацкія работы». Тут ён адразу ж уключаецца ў грамадскае і творчае жыццё рэспублікі. Многа сіл аддае аб'яднанню беларускіх мастакоў, якія актыўна ўдзельнічалі ў адраджэнні беларускай культуры. Станюта быў адным з арганізатараў першай мастацкай выстаўкі восенню 1921 года ў Мінску. З той пары вось ужо 50 год вядуць свае творчыя справаздачы беларускія мастакі.

Дваццатыя гады. Гэта час небывалага ўздыму духоўных і творчых сіл беларускага народа. Бурна развіваюцца літаратура, тэатральнае мастацтва, адкрываецца Беларускі дзяржаўны універсітэт. Гады першых пяцігодак мяняюць і тэматыку выяўленчага мастацтва. Само жыццё ва ўсёй сваёй шматграннасці і шырыні становіцца галоўным героем, галоўнай тэмай новага часу. Адным з першых М. П. Станюта натхнёна працуе над вялікай шматпланавай кампазіцыяй «Будаўніцтва універсітэта ў Мінску». Мастак з поўнай аддачай і захапленнем піша эцюды, робіць сотні эскізаў алоўкам. Ён перадае пачуццё нялёгкай і ў той жа час радаснай працы, энтузіязм маладых рабочых. Рытм новага жыцця, радасць свабоднага савецкага чалавека Станюта змог перадаць і ў многіх партрэтах сучаснікаў: «За работай», «Фізкультурнік», «Камсамолка», «Дапрызыўнік».

На жаль, у гады гітлераўскага ашэсця работы М. Станюты загінулі. Цяпер ён жыве радасцю і гордасцю за сваіх вучняў, кім прывіў любоў да жывапісу дапамог выбраць лёс мастака. ярод яго вучняў вядома імя . К. Цвірко, народнага мастака ССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэіі Беларускай ССР.

Той, хто пабываў у выставачнай ле Саюза мастакоў БССР на рсанальнай выстаўцы М. Стаоты, не мог не заўважыць патно «Бетоншчыкі», якое расказе аб людзях, паклаўшых перыя кубаметры бетону на будаўцтве універсітэта.

В. ПАЛІКАРПАЎ,
студэнт завочнага факультэта.

# У ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ СЯМ'І

Наш БДУ па праву лічыцца інтэрнацыянальнай вышэйшай навучальнай установай. Бо сёння ў ім, акрамя шматтысячнай арміі савецкіх студэнтаў, на розных факультэтах і ў аспірантуры займаюцца 392 юнакі і дзяўчыны больш чым з 20 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Толькі на падрыхтоўчы факультэт сёлета прыехалі 133 маладыя прадстаўнікі ДРВ, Кубы, Алжыра, Народнай Рэспублікі Конга, С'ера Леоне, Самалі, Танзаніі і Непала. Тут для іх створаны ўсе ўмовы для плённай вучобы і добрага адпачынку. Разам з савецкімі сябрамі яны жывуць у добраўпарадкаваных інтэрнатах, атрымліваюць стыпендыю, бясплатна карыстаюцца бібліятэкамі і чытальнымі заламі, кабінетамі, лабараторыямі, сучасным навучальным абсталяваннем. Адпачываюць у спартыўнаaздараўленчым лагеры ля возера Нарач, у дамах адпачынку, у санаторыях, праводзяць свой вольны час у турысцкіх аўтапаяздах «Дружба». З вялікай цікавасцю моладзь знаёміцца з нашай савецкай рэчаіснасцю, удзельнічае ў сустрэчах з віднейшымі вучонымі рэспублікі, дзяржаўнымі дзеячамі, пісьменнікамі, ветэранамі вайны, перадавікамі вытворчасці. Частыя госці іншаземныя студэнты на прамысловых прадпрыемствах Мінска, у яго дашкольных дзіцячых установах, сярэдніх школах.

Савецкую краіну, нашу Беларусь многія з замежных студэнтаў называюць сваёй другой радзімай, а студэнцкі інтэрнат сваім другім домам. Бо адчуваюць сябе яны тут сапраўды як дома. Актыўна ўдзельнічаюць у органах студэнцкага самакіравання, такіх, як студсавет інтэрната.

Бывае, вечарам збяруцца ў ленпакоі студэнты фізічнага факультэта Валерый Сізоў і Тамара Яфрэменка, студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі Таццяна Кляўко, студэнты падрыхтоўчага факультэта в'етнамец Тонг Дзінь Куі і кангалезец Паату Памбу Жорж і абмяркоўваюць, як лепш адзначыць савецкае ці нацыянальнае свята краіны, з якой прыехалі да нас студэнты, або арганізаваць адпачынак студэнтаў, іх быт, якую лекцыю прапанаваць юнакам і дзяўчатам, каму дапамагчы ў вучобе і г. д.

А рэдкалегія насценгазеты інтэрната «Дружба» ў складзе студэнткі-журналісткі Алы Багачовай, студэнтаў падрыхтоўчага факультэта кубінца Карласа Гансалеса Ранні, самалійца Абдзі Абдалы Фараха і в'етнамца Нгуен Ціен Тханга заклапочана, як лепш адлюстраваць у чарговым нумары важнейшыя падзеі з жыцця студэнцтва. Кожны дзень насычан вучобай, цікавымі справамі.

Студэнты - іншаземцы ахвотна ўдзельнічаюць у гуртках мастацкай самадзейнасці. Харавы калектыў падрыхтоўчага факультэта, у складзе якога юнакі і дзяўчаты з васьмі краін свету, пад кіраўніцтвам студэнткі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ніны Мандрыкінай зараз развучвае песню кампазітара А. Новікава на словы Л. Ашаніна «Леніна памятае зямля». А ў рэпертуары яшчэ значацца песня «Зямлю трэба любіць» кампазітара В. Левашова на словы А. Собалева, «Песня аб Мінску», музыка Ул. Кузняцова і іншыя. Шмат увагі ўдзяляе Ніна Мандрыкіна і салістам. Кангалезскі студэнт Гатсона Базіле працуе над песняй Б. Фрэнкеля «Рускае поле». В'етнамскія дзяўчаты рыхтуюць «Крыніцы». Зразумела, у рэпертуары шмат і нацыянальных песень і танцаў.

— Але самае цікавае, — гаворыць Н. Мандрыкіна, — што падрыхтоўчы факультэт не забываюць яго выпускнікі. Напрыклад, в'етнамец Во Тхань Хунг цяпер займаецца на матэматычным факультэце, а ў наш гурток прыходзіць рэгулярна. У мінулым годзе ён выконваў песню з кінафільма «Шчыт і меч» «З чаго пачынаецца Радзіма». А зараз працуе над песнямі «Лёс» (муз. А. Бабаджаняна, сл. Р. Раждзественскага), «Таварыш» (муз. А. Іванова, сл. А. Пракоф'ева) і іншымі.

Неўзабаве прыйдзе той час, калі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці выступяць з канцэртамі ў школах, на прадпрыемствах, у калгасах.

Свае ўражанні аб жыцці ў нашай краіне замежныя сябры выказваюць у факультэцкай насценгазеце «Дружба», у радыёгазеце, у сваіх сачыненнях і ў пісьмах родным дамоў.



Студэнты IV курса факультэта прыкладной матэматыкі **Ахмед Амар Асман** (Самалі) і **Аляксей Сычоў** на практычных занятках у аўдыторыі малых вылічальных машын.



Нямецкія студэнткі-першакурсніцы з матфака **Вераніка Хоппе** і **Рыта Шультцэ** авалодваюць рускай мовай.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

Вось што піша ў насценгазеце «Дружба» в'етнамка Нгуен Мінь Ха:

«На падрыхтоўчым факультэце універсітэта нам створаны ўсе ўмовы для добрай і выдатнай вучобы. Усе выкладчыкі клапоцяцца аб нас. Знаходзячыся далёка ад сваёй Радзімы, мы не адчуваем адзіноцтва. Тут мы маем шмат шчырых, добрых сяброў».

Нібы працягваючы думку сваёй сяброўкі, в'етнамец Нгуен Хыу Дык піша:

«Мы вельмі ганарымся тым, што вучымся ў краіне Леніна. Мы стараемся добра вучыцца, каб вярнуцца на радзіму высокакваліфікаван ы м і спецыялістамі...»

Сёлета падрыхтоўчы факультэт адзначыў сваё дзесяцігоддзе. Яго закончылі 1170 студэнтаў з 27 краін свету. Усе яны працягвалі ці яшчэ працягваюць вучобу па выбранай спецыяльнасці на асноўных факультэтах БДУ і іншых навучальных устаноў 25 гарадоў Савецкага Саюза. Многія былыя студэнты факультэта закончылі вну і зараз з савецкімі дыпломамі працуюць у сябе на радзіме. Кубінка Тэрэсіта Дэ Гомес Коста— старшы інжынер упраўлення Міністэрства сельскай гаспадаркі Кубы, кубінец Арланда Рэйноса працуе ў Акадэміі навук Кубінскай Рэспублікі, афрыканскі юнак Артур Батса — выкладчык універсітэта ў Акры. Выхаванец фізічнага факультэта універсітэта в'етнамец Нгуен Куанг Мінь працаваў некалькі гадоў выкладчыкам аднаго з інстытутаў у Ханоі, а зараз вярнуўся ў Мінск і паступіў у аспірантуру БДУ. Неўзабаве малады вучоны абароніць кандыдацкую дысертацыю і вернецца зноў на радзіму.

У інтэрнацыянальнай студэнцкай сям'і дзеці розных народаў здабываюць глыбокія веды, знаёмяцца са шматгранным жыццём нашай краіны, пазнаюць плён бескарыслівай дружбы.

У. ГАЛАЙША.

ДАЎНО адгрымелі бai, адышлі ў мінулае цяжкія дні выпрабаванняў, але памяць аб іх заўсёды жывая.

**Першы яго баявы вылет быў нешчаслівы. Група штурмавала калону танкаў, што рваліся да Сталінграда. Ён так захапіўся, што забыўся пра ўсё на свеце. А апамятаўся толькі тады, калі па самалёту ўдарыла кулямётная чарга. Адразу ўбачыў, што вельмі адарваўся ад сваіх. Перабіта рулявое кіраванне, ранена рука, не бачыць левае вока. І адна думка свідруе мозг: «Трэба дабрацца да сваіх». У нейкім ліхаманкавым узбуджэнні лавіраваў, пазбягаючы нямецкіх атак, і ўсё ж пасадзіў самалёт на нашым аэрадроме. Вылазіў у невялікую фортку (кабіну заклініла). І толькі калі падбеглі таварышы і санітары, неяк абмяк і, перш чым чорная коўдра непрытомнасці ахутала ўсю істоту, папрасіў: «Не трэба ў шпіталь...»**

Затаіўшы дыханне, слухае прыціхшы зал апавяданне. На трыбуне невысокі чалавек у ваеннай форме — генерал-маёр, двойчы Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык СССР Леанід Ігнатавіч Бяда.

# СУСТРЭЧА З ЛЕГЕНДАЙ

**Гэта быў першы і апошні раз за ўвесь час вайны, калі яго самалёт атрымаў прабоіну. Потым быў Данбас, Крым, Нікапальскі плацдарм.**

**— Мы тады павінны былі атакаваць нямецкія танкі. Па рацыі перадалі, што ў нашым напрамку рухаюцца дзявяткі нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў. Яны ішлі на фоне заходзячага сонца. Гэта было жудаснае відовішча. Рашэнне прыйшло імгненна: атакаваць... Некалькі самалётаў было збіта, астатнія павярнулі назад. ...І танкі ў гэты раз не прайшлі.**

Расказваюць, калі Леанід Ігнатавіч падымаў сваіх хлопцаў у паветра, немцы перадавалі: «Увага, увага! У паветры Бяда!» Яны страшэнна баяліся рускага аса, раней марыўшага аб зусім мірнай прафесіі настаўніка.

**— Аб лётчыках, якія штурмавалі Сапун-гару, камандуючы арміяй сказаў, што яны вынеслі пяхоту на сваіх крылах.**



Адным з іх быў Леанід Ігнатавіч Бяда. Ужо ў Беларусі атрымаў ён першую Зорку Героя за баі ў Крыме, другую — за штурм Кенігсберга, а за вызваленне Беларусі быў узнагароджан ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга.

Баявое хрышчэнне Л. І. Бяда атрымаў сяржантам. Сустрэў перамогу маёрам, двойчы Героем Савецкага Саюза, намеснікам камандзіра палка.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

# ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ ДА НАС...

Зборы былі нядоўгімі. Учора Валодзя Купрыенка дамовіўся з камандаваннем часці БВА, у якой калісьці служыў, а сёння мы — студэнты II курса—едзем у гэтую часць з канцэртам мастацкай самадзейнасці.

У аўтобусе адбываецца па сутнасці першая і, як потым аказалася, апошняя рэпетыцыя. Настрой ва ўсіх—лепшага жадаць нельга.

У армейскім клубе яблыку няма дзе ўпасці. Ваеннаслужачыя і члены іх сем'яў даўно ўжо чакаюць нас. Прыходзіцца пачынаць з месца ў кар'ер.

Чытае свае вершы былы салдацкі паэт, цяпер студэнт Міхаіл Вяргейчык. Прымаюць яго вельмі цёпла. Але асаблівы поспех выпадае на долю дзяўчат, спявачак Алы Бялько, Ніны Дзядзюк, Лены Сінькевіч і іх нязменнага акампаніятара Тамары Курленка.

Уважліва сочыць зала за тым, як Уладзімір Субат паказвае ў пантаміме дзяўчыну, якая збіраецца на спатканне. Дружны смех суправаджае гэтую вясёлую сцэнку.

А калі ў віхры танца на сцэну літаральна ўлятаюць Тамара Субач і Уладзімір Субат, гледачы ў захапленні прыўстаюць, потым паціху супакойваюцца, а пасля ўзнагароджваюць танцораў шчырымі апладысментамі.

Міша Нікішын выконвае пад гітару дзве песні з рэпертуару свайго салдацкага юнацтва. І зноў танец, на гэты раз жартоўны, выконваюць Аня Фядотава і Света Бязручка. У заключэнне ўдзельнікі канцэрта разам з гледачамі спяваюць «Песню журналістаў».

Зампаліт часці ад імя прысутных і камандавання дзякуе за змястоўную, цікавую праграму і ўручае самадзейным артыстам грамату.

Да самага аўтобуса суправаджаюць нас удзячныя гледачы.

— Прыязджайце да нас, калі ласка, яшчэ.

— Запрашайце нас да сябе.

Да новых сустрэч, сябры!

В. ЯНОЎСКІ.

# САЮЗНІКІ ЗДАРОЎЯ

Дэканат, партыйная і камсамольская арганізацыі біялагічнага факультэта, выконваючы рашэнні партыі і Савецкага ўрада, удзяляюць значную ўвагу развіццю аздараўленча - спартыўнай работы сярод студэнтаў.

У гэтым навучальным годзе 279 студэнтаў займаюцца фізічным выхаваннем пад кіраўніцтвам выкладчыкаў, 76 з іх трэніруюцца ў агульнауніверсітэцкіх спартыўных секцыях, 22 уваходзяць у саставы зборных каманд універсітэта па розных відах спорту.

У мінулым навучальным годзе ў 21 спаборніцтве, якія праводзіліся універсітэтам і факультэтам, прыняло ўдзел каля 400 студэнтаў. Выступаючы ў XIX агульнауніверсітэцкай спартакіядзе, зборныя каманды факультэта ў агульным заліку занялі пятае месца.

Цяпер на факультэце займаецца рад студэнтаў-спартсменаў, якімі па праву ганарыцца калектыў біяфака. Гэта А. Нечапурэнка — студэнт V курса, ленінскі стыпендыят, майстар спорту па фехтаванню, С. Усанаў — студэнт IV курса, выдатнік вучобы, член зборнай каманды універсітэта па баскетболу, В. Ярута — студэнтка IV курса, член зборнай каманды СДСТ «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы, Е. Цярэхіна — студэнтка II курса, майстар спорту па мастацкай гімнастыцы, Г. Барысава — студэнтка II курса, кандыдат у майстры спорту па спартыўнай гімнастыцы і многія іншыя.

Вялікія задачы стаяць перад калектывам факультэта ў юбілейным годзе. Зборныя каманды па 18 відах спорту прымуць удзел у XX агульнауніверсітэцкай спартакіядзе. Пройдуць спаборніцтвы паміж курсамі па кросу, лёгкай атлетыцы, валейболу, баскетболу, стральбе, лыжах, шахматах і шашках. Яны, несумненна, прыцягнуць у спартыўны калектыў новых членаў, паслужаць выхаванню ў студэнтаў такіх цудоўных рыс, як калектывізм, дружба, таварыства, узаемадапамога, воля, мужнасць.

Спартыўнае бюро факультэта вызначыла саставы зборных каманд на 1971-72 навучальны год, зацвердзіла адказных па відах спорту. У састаў зборных каманд увайшло 137 студэнтаў

Добры пачатак у XX агульнауніверсітэцкай спартакіядзе зрабілі студэнты факультэта, заняўшыя I месца ў асеннім кросе. Вялікі ўклад у перамогу ў гэтым спаборніцтве ўнеслі першакурснікі, якія выйгралі крос сярод першых курсаў універсітэта. Пераможцамі ў асабістым першынстве сталі студэнты біяфака Вольга Ярута і Уладзімір Барысёнак (на здымках справа). Паспяхова выступіла ў першынстве універсітэта зборная каманда факультэта па футболу, заняўшы III месца.

З вялікай аддачай, рыхтуючыся да будучай спартакіяды, працуюць А. Нечапурэнка, А. Быкаў, С. Усанаў, В. Ярута, А. Камскі, Ю. Абакумаў, О. Александровіч, В. Шкуматаў, Е. Цярэхіна, Г. Барысава, А. Васючкоў, В. Аўчыннікаў, В. Барысёнак і многія іншыя.

Аднак нямала і такіх спартсменаў, што, перайшоўшы на старэйшыя курсы, перасталі трэніравацца. Гэта, напрыклад, В. Радзюк, В. Клейман, С. Кунавіна, Г. Парахневіч, Т. Карпава, Г. Кашына, А. Прыхожая, Л. Ларыёнава, Е. Міхайлава, А. Каваленка, А. Лакатко, А. Грэшчык, Д. Гардзей, В. Мурза і іншыя.

Студэнты, уключаныя ў саставы зборных каманд, якія не займаюцца ў секцыях, не змогуць належным чынам абараніць гонар свайго факультэта. Думаю, камсамольскай арганізацыі неабходна звярнуць увагу на такіх студэнтаў.

Далучэнню шырокіх мас студэнтаў да вучэбна-спартыўнай работы павінны садзейнічаць факультэцкія секцыі, дзейнасць якіх неабходна разгарнуць па стралковаму спорту, турызму, настольнаму тэнісу, шахматах, шашках і іншых відах спорту. Камітэту камсамола факультэта неабходна заахвочваць работу спартыўных секцый і заняткі ў іх студэнтаў, таму што няма лепшых саюзнікаў, чым фізкультура і спорт, у правільнай арганізацыі рэжыму працы, вучобы, адпачынку, умацаванні здароўя.

Тыя, хто сёння слухае лекцыі і здае залікі, заўтра стануць кіраўнікамі вытворчасці, вучонымі, педагогамі, творцамі новых культурных каштоўнасцей. І ад таго, якую падрыхтоўку і загартоўку атрымае спецыяліст у сценах вышэйшай навучальнай установы, у рашаючай ступені залежыць поспех яго будучай работы.

Калектыў біялагічнага факультэта, удзельнічаючы ў XX агульнауніверсітэцкай спартакіядзе, мае магчымасць дабіцца лепшых вынікаў у спартыўна-масавай рабоце.

**В. ШАПЯЛЕВІЧ,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



**НА ЗДЫМКУ:** футбольная каманда біяфака.





# «МАМА, Я ХАЧУ ДАМОЎ», АБО ДЫЯЛОГ МІЖВОЛІ

Чытальная зала перапоўнена. А мне ж трэба падрыхтавацца да практычных заняткаў па беларускай мове. Што рабіць? Кажуць, студэнт ніколі не адчайваецца і знаходзіць выйсце. Знайшоў і я свабодную аўдыторыю і сеў за стол, каб заняцца справамі. І раптам: «Мама!!! Я хачу дамоў!» Гэты крык зафіксіраваны на крышцы стала размашыстым почыркам. Ён прыцягвае позірк. Але зараз жа супакойваюся: першакурсніца нярвуе.

«Ох, і абрыдла ўсё! Калі ж спыняцца нашы пакуты?»

Міжволі падумалася: «У зімовую сесію».

Гэты россып студэнцкіх пачуццяў ззяе рознымі гранямі — у залежнасці ад таго, за які стол вы сядзеце. Не верыце, што такі дыялог адбыўся? Тады загляніце ў аўдыторыі №№ 601, 433, 416 галоўнага корпуса і ў аўдыторыі іншых карпусоў універсітэта і вы, як і я, знойдзеце нябачнага субяседніка.

С. УЛАДЗІМІРАЎ.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 09502
Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1404.